Комплексны занятак, праведзены ў рознаўзроставай групе з выхаванцамі 5-6 гадоў

Тэма: «Дзе схавалася вада?» (дзіця і прырода + маляванне)

Выхавацель 1 кваліфікацыйнай
катэгорыі Грэмяка С. В.

Праграмны змест: стварыць умовы для развіцця ведаў у дзяцей пра ўласцівасць і стан вады; садзейнічаць фарміраванню элементарных навыкаў эксперыментальнай дзейнасці; развіваць пазнаваўчыя псіхічныя працэсы; абагуліць веды аб правільным выкарыстанні вады

Ход занятку

**В.** Прывітаемся з гасцямі. Які сёння цудоўны дзень, давайце ўсміхнёмся адзін аднаму, каб гэты дзень стаў для нас адным з самых прыгожых і непаўторных. Якая пара года зараз?

**Дз**.Зараз на вуліцы прыгажуня-зіма.

**В.** А хто нам раскажа верш пра зіму? (адзін з выхаванцаў расказвае верш пра зіму)

**В**.Цудоўна. А давайце мы з вамі намалюем зіму. Сядайце за сталы, пачынаем працаваць. Але так здарылася, што ў шклянках зусім няма вады. Дзеткі, здаецца мне, што вада хоча пагуляць з намі ў хованкі. Ну што, давайце пашукаем, дзе яна схавалася ад нас? Адпраўляемся ўсе разам у падарожжа на пошукі вады.

**1прыпынак. "Кухня"**

**В.**Дзе жыве вада на кухні?

Дз. Вада жыве ў кране.

**В.**Так, а яшчэ вада знаходзіцца вось у гэтым чайніку. А давайце паспрабуем на смак і скажам, што знаходзіцца ў чайніку?

**Дз.** У чайніку знаходзіцца самы карысны напітак – чай.

**В.**А што патрэбна для таго, каб заварыць чай?

**Дз.** Для таго, каб заварыць чай, нам спатрэбяцца вада, чайная трава.

**В.** А які чай на смак?

**Дз.**Чай вельмі салодкі, цёплы, смачны, духмяны. Яго прыемна піць.

**В**. А ці можам мы маляваць пры дапамозе вады, з якой зварылі чай?

**Дз.** Не, для малявання нельга выкарыстоўваць такую ваду. Чай патрэбна піць.

**2 прыпынак. " Цырульня"**

**Выкарыстоўваецца місачка з вадой, мачалка**.

**В.** Цікава, а дзе ж у цырульні ў нас знаходзіцца вада? Давайце возьмем мачалку і сціснем яе. Вось і вада. Для чаго патрэбна тут вада?

**Дз.**Для ўборкі. Для таго, каб вымыць усё навокал і радавацца чысціні.

**В**. Тады давайце пратром гэту палічку, каб яна стала чыстай. Малайцы. Можам мы такой вадой маляваць?

**Дз.**Не, нельга. Вада патрэбна для ўборкі памяшкання.

**В.** Тады прадоўжым пошукі патрэбнай нам вады.
**3 прыпынак. “Вугалок прыроды”**

**В.** Дзеткі, скажыце, куды ж ад нас зноў схавалася вада?
**Дз.** Мы думаем, што ў гаршочках з раслінамі.
**В.** Так, сапраўды ў гаршочках з раслінамі. Дакраніцеся пальчыкамі да зямлі і вы адчуеце, што яна вільготная.
**В.** А для чаго раслінам патрэбна вада?
**Дз.** Каб напаіць пакаёвыя кветачкі, зрабіць зямлю вільготнай.
**В**.А хто не можа жыць без вады?
**Дз.**Усё жывое на зямлі не можа жыць без вады.
**В.** Давайце паліём тыя расліны, якія хочуць піць. А ці можам мы узяць з гаршочка з кветкамі ваду для малявання?
**Дз.** Не, не можам. Нельга адбіраць ваду ў пакаёвых раслінак.

**В.Давайце адпачнём, пагуляем. Рухомая гульня “ Кропелька раз, кропелька два”**

**В.**Дзеці, а дзе яшчэ ў нас у групе жыве вада?
**Дз.** У нас у групе вада яшчэ жыве ў вадаправодным кране.
**В.**Тады на хвілінку адкрыем кран. Для чаго нам цяпер патрэбна вада з крана?
**Дз.** Для таго, каб намаляваць зіму.
**В.** Вось мы і знайшлі патрэбную для нас ваду, а значыць зможам намаляваць чароўную прыгажуню-зіму. А яшчэ вельмі важна навучыцца берагчы ваду. Якім чынам можна зберагаць ваду дома?
**Дз.**Своечасова закрываць кран з вадой, не разліваць ваду без патрэбы, не абліваццца вадой.
**В.**Цяпер набіраем кожны сабе ў шклянку вады з крана і садзімся маляваць. А дзе зімою хаваецца вада?
**Дз.** Вада хаваецца ў лёдзе, сняжынках.
**В.** Так, кропелькі вады зімою ператвараюцца ў цудоўныя сняжынкі, а калі вельмі холадна, то вада становіцца лёдам. Давайце мы намалюем многа-многа сняжынак, каб дзеду Марозу было зручней да нас даехаць на чароўных санях. За працу, сябры!
У канцы занятку ствараецца выстава пад назвай “Чароўная прыгажуня-зіма”